# ВОДГУК

на аўтарэферат дысертацыі В.А. Мусіенкі «Семантычная дэрывацыя ў сферы ментальных намінацый: на матэрыяле беларускай і англійскай моў», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства

Аўтарэферат дысертацыі В.А. Мусіенкі «Семантычная дэрывацыя ў сферы ментальных намінацый: на матэрыяле беларускай і англійскай моў» дазваляе сцвярджаць, што даследаванне характарызуецца высокай ступенню актуальнасці і навізны. Праца вырозніваецца лагічнасцю, паслядоўнасцю выкладу моўнага матэрыялу, густоўным навуковым стылем і ўражлівым лінгвістычным кругаглядам аўтара.

Дысертант эфектыўна вырашае пастаўленыя задачы і ў выніку ўпершыню ў айчынным і замежным мовазнаўстве прадстаўляе комплекснае даследаванне другасных намінацый ментальнай сферы. Прыцягненне да аналізу лексічных адінак розных лексіка-граматычных разрадаў слоў (субстантываў, ад’ектываў, дзеясловаў) дазволіла прадэманстраваць спецыфіку рэалізацыі семантычнай дэрывацыі, у выніку якой больш канкрэтныя прадметныя, кваліт атыўныя і акцыянальныя паняцці эмпірычнага ўзроўню рэчаіснасці атрымліваюць увасабленне ў абстрактных вобразах і ўяўленнях шырокага ментальнага кантынуума, што, безумоўна, з’яўляецца сведчаннем асацыятыўнасці мыслення і цеснай сувязі рацыянальна-разумовай і канкрэтна-пачуццёвай, навуковай сфер пазнання.

Дысертацыя, як гэта бачна з аўтарэферата, складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і трох дадаткаў. У першай главе «Катэгорыя ментальнасці ў сучаснай навуковай парадыгме» разглядаюцца пытанні, звязаныя з феноменам ментальнасці, размежаваннямі паняццяў *ментальнасць* і *менталітэт*, спецыфікай семантычнай дэрывацыі ў сферы ментальных намінацый. Другая глава прысвечана субстантыўным і ад’ектыўным ментальным намінацыям і асноўным метафарычным мадэлям. Найбольш прадстаўнічым паводле ахопу матэрыялу з’яўляецца раздзел «Ад’ектыўныя намінацыі», у якім разглядаюцца другасныя ментальныя лексіка-семантычныя варыянты, утвораныя ад першасных значэнняў параметрычных, каларатыўных, люмінальных, тэмпературных, кансістэнтных, густаторных, вагавых, гукавых, альфакторных і іншых ад’ектываў. Аўтар звяртае ўвагу на тое, што другасная семантыка ад’ектываў у многіх выпадках вызначаецца крыніцай матывацыі і пры пераходзе ў рэцыпіентную ментальную сферу захоўвае бінарныя антанімічныя апазіцыі, супрацьпастаўленыя па такой градуальнай шкале адзнак, як «больш за норму» – «менш за норму». Трэцяя глава складаецца з дзвюх частак, у першай з якіх разглядаюцца дзеяслоўныя адзінкі, зыходная семантыка якіх арыентавана на

выяўленне руху, канкрэтных фізічных дзеянняў і станаў, люмінальных, тэмпаральных і іншых паказчыкаў, што выкарыстоўваюцца для выяўлення інтэлектуальных працэсаў і ментальна-псіхалагічных станаў чалавека. У другой частцы разглядаюцца сінтаксічныя спалучэнні розных дзеясловаў з субстантывам *думка,* якія з'яўляецца найбольш яскравым кампанентам ментальнасці і ў розных кантэкставых акружэннях матэрыялізуе разнастайныя аспекты ментальнасці. Важным з'яўляецца ўстанаўленне тыпалагічнага падабенства і нацыянальна-культурных адрозненняў беларускіх і англійскіх ментальных намінацый, якія па характары сэнсавай суаднесенасці ў кожнай з моў аб'ядноўваюцца ў групы з адносінамі супадзення, частковага несупадзення і безэквівалентнасці.

Паспяховаму рашэнню пастаўленых у дысертацыі задач садзейнічала канструктыўная методыка даследавання, выпрацаваная ў адпаведнасці са спецыфікай аб'екта і прадмета даследавання. Абгрунтаванасць, дакладнасць палажэнняў, вывадаў і рэкамендацый пацвярджаецца багатым фактычным матэрыялам (642 лексічныя адзінкі беларускай мовы і 636 лексічных адзінак англійскай мовы). Многія фрагменты даследавання суправаджаюцца колькаснымі падлікамі, табліцамі, малюнкамі і дыяграмамі, якія ўзмацняюць доказную базу асноўных палажэнняў, робяць вывады максімальна канкрэтнымі. Не выклікаюць сумненняў і сфармуляваныя пункты рэкамендацый па практычным выкарыстанні вынікаў даследавання.

Мяркуючы па аўтарэфераце, дысертацыя В.А. Мусіенкі «Семантычная дэрывацыя ў сферы ментальных намінацый: на матэрыяле беларускай і англійскай моў» адносіцца да ліку даследаванняў, якія ўзбагачаюць уяўленні аб спецыфічных і агульных рысах у мове, культуры і менталітэце розных народаў, і ўносіць значны ўклад у тыпалагічнае мовазнаўства, сучасную кампаратывістыку, семасіялогію, лексікаграфію. Яна з'яўляецца завершаным, сур'ёзным і арыгінальным навуковым даследаваннем, у якім на высокім навуковым узроўні прапануецца рашэнне пастаўленых у працы задач. У сувязі з гэтым лічу, што аўтар дысертацыі «Семантычная дэрывацыя ў сферы ментальных намінацый: на матэрыяле беларускай і англійскай моў» Васіль Анатольевіч Мусіенка заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае, супастаўляльнае моваознаўства.

Доктар філалагічных навук
прафесар

В.І. Іўчанкаў

ПОДПИСЬ ... УДОСТОВЕРЯЮ
Зам. начальника управления
организационной работы и
документационного обеспечения
Е.Н.Зинкевич
« 22 » ... 20__ г.